# Калейдаскоп

**красавік 2022**

**Школьная газета №8 (38)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**

Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. **(А.Крывіцкі)**

Мова, прыгожае пісьменства, паэзія, музыка – сродак сувязі між душамі людзей, вышэйшы сродак. **(Уладзімір Караткевіч)**

Выбірай: быць пасрэднасцю на мове суседа або нечым значным на сваёй. **(Уладзімір Караткевіч)**

Беларус-католік ці беларус-праваслаўны павінны то помніць, што ў іх адна Бацькаўшчына – Беларусь, адна мова родная – беларуская, адны звычаі, адвеку перададзеныя з пакалення ў пакаленне. **(Янка Купала)**

Там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы, народ той мёртвы, а той край нямы. **(Генадзь Бураўкін)**

Мова – гэта этыка. Гэта наша спрадвечнае разуменне таго, што ёсць дабро і што ёсць зло, зашыфраванае ў словах. **(Віктар Марціновіч)**

Без усведамлення, што такое мова ў жыцці народа, што такое нацыянальная культура, нацыянальная гісторыя, у народа не можа быць будучыні. **(Ніл Гілевіч)**

Мова – аснова не толькі нацыянальнай культуры, але і існавання нацыі, існавання этнасу. **(Васіль Быкаў)**

Мова — гэта код, які адкрывае дзверы ў тую або іншую культурную прастору. А культура — гэта пераемнасць, спадчына, традыцыя, алюзія. **(Сяргей Абламейка)**



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**

РАЗАМ З ДЗЕЦЬМІ



## Слухай родную прыроду: красавік вясну ўпрыгожвае, зямельку ўлагоджвае

**Вясна набірае сілу. Неба стала вышэйшым, блакітным, празрыстым. Сонейка не толькі свеціць, але ўжо і грэе, нараджаючы новае жыццё. У лесе з'явіліся рознакаляровыя крапінкі — расліны-першацветы. Паўсюль паветра поўніцца птушынымі спевамі. Абуджаюцца чмялі, пчолы, мухі, матылі... Як толькі зямля адтала, пачынаецца актыўная праца ў земляробаў — вясновы дзень год корміць.**

### Як хараша квітнеюць краскі — з іх вясна дываны свае тчэ...



Першацветамі называюць самыя раннія кветачкі-вяснянкі. Яны з'яўляюцца раней за лісце на дрэвах. Хутчэй за ўсіх спяшаюцца пацешыць вока белыя падснежнікі і залаціста-жоўтыя сонейкі падбелу. Услед за імі "выстрэльваюць" фіялетава-блакітныя пралескі (пячоначніцы) і белыя кураслепы. Вельмі прыгожыя кветачкі! Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што другі месяц вясны — красавік — мае адпаведную назву.

Дарэчы, у многіх нашых раслін ёсць радня па ўсім свеце. Сярод іх — кураслеп. У Беларусі сустракаюцца дуброўны (белая пралеска), казяльцовы (казарост жоўты) і лясны кураслеп, які занесены ў Чырвоную кнігу.

У хваёвых лясах, на высечках, лугах трапляецца сон-трава з буйнымі, пераважна фіялетавага колеру кветкамі.

З маладога лісця прымулы (у народзе яе называюць баранчыкі, ключыкі), дзьмухаўца, крапівы гатуюць розныя стравы, багатыя вітамінамі. Многія першацветы маюць лекавыя вартасці.

### Загадкі

*З-пад снегу выйшла,*
*Расцвіла,*
*І так,*
*Што аж зіма ўцякла.*

**Міхась ПАЗНЯКОЎ**

*На сцяблінцы, на калматай*
*Шэсць пялёсткаў ліловатых.*
*Кветка гэтая і ў сне*
*Ўсміхаецца вясне.*

**Васіль ЖУКОВІЧ**

### Коцікі на дрэвах

Яшчэ пупышкі не выпусцілі лісце, а дрэвы і хмызнякі зацвілі катышкамі і коцікамі. Упрыгожыла сябе ў бурavата-чырвоны колер вольха, чырвонымі і зялёнымі каташкамі прыбралася асіна. Стала пухнатай вярба...

*За вёскай ля балоцінкі,*
*У галлі вярбы старой,*
*Маленечкія коцікі*
*Хаваліся зімой.*
*Салодка спалі*
*ў коўдрачках,*
*Чакаючы*
*вясну,*
*Прыгрэла сонца*
*шчодрае —*
*Збудзіліся ад сну.*
*Паскідвалі*
*ўсе чысценька*
*Адзежыны з сябе*
*І, жоўтыя,*
*пушыстыя,*
*Паселі на вярбе.*

**Кастусь ЦВІРКА**



### Злаві сонейка!

"Ходзіць курка-жаўтушка па сцяне і не шуміць..." Здагадаліся, пра якую "курку" склалі ў народзе загадку? А здараецца, па сценах скача "зайчык". Гэта сонейка з намі гуляе. Пагуляй і ты з ім — вазьмі невялікае люстэрка і злаві сонейка.



## Плача бярозка...

У красавіку вельмі актыўны рух соку — дрэвы ажываюць, набухаюць пупышкі. Усім дрэвам добра, акрамя бярозкі. Кожную вясну многія людзі імкнуцца здабываць бярозавы сок — бярозавік. Вельмі часта робяць гэта няўмела і неашчадна. Яны прыходзяць да дрэў з сякерамі, нажамі. З параненага дрэва сапраўды нацякаюць слоікі і нават вёдры соку, але бярозы пасля гэтага пачынаюць хварэць, а праз 2—3 гады засыхаюць.

Кожны з нас адказвае за свае ўчынкі. Каб потым не шкадаваць аб іх, прачытай вершы і зрабі свой выбар. А яшчэ паназірай за бярозай і адкажы, што раней з'яўляецца на яе галінках: пупышкі, лісточкі, кветкі-каташкі?

*Плача бярозка,*
*Плача бярозка,*
*Цякуць па сарочцы*
*бяроставай слёзкі.*
*Бяжыць і бяжыць*
*За слязінкай слязінка...*
*Дрэўца пашкодзіў*
*сякераю Дзімка.*

**Іван МУРАВЕЙКА**



**Прыкмета**
З бярозы цячэ многа соку — да дажджлівага лета.

*Сумуюць ля вёскі*
*Чатыры бярозкі.*
*Крыху б пашаптацца,*
*За рукі б пабрацца,*
*Ды зводдаль адна ад другой*
*Пасаджаны дрэўцы вясной.*
*А я пасаджу паміж імі*
*Сяброўак іх светлых і мілых.*
*Няхай яны водзяць заўсёды*
*Вясёлыя тут карагоды.*

**Міхась ПАЗНЯКОЎ**

## Загадкі

*Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а без валасоў.*

*Уздоўж дарогі сталі ў рад*
*Сёстры, нібы на парад,*
*У спаднічках белых, вузкіх,*
*У зялёных пышных блузках.*



## Зямля пад белымі крыламі

Бусел — найдаражэйшая для беларусаў птушка. Ніякая іншая не мае столькі назваў, нічыё гняздо не ахоўваецца так людзьмі. Бусел — герой дзіцячых забаўлянак, вершаў, казак. З буслам параўноўваюць адметнасці паставы і паводзін чалавека: цыбаты, як бусел; бы той бусел, даўганосы; дзыгае, як бусел. Пра бусла складаюцца песні, легенды, паданні, з ім звязана шмат павер'яў. Ад яго імя ўтвораны назвы населеных пунктаў, раслін. А якую краіну называюць "Зямля пад белымі крыламі"? Нашу родную Беларусь.

*Будуюць буслы буслянку.*
*Работа кіпіць ад ранку.*
*Галінкі збіраюць, пер'е.*
*Народнае кажа павер'е,*
*Што шчасце паселіцца ў хаце,*
*Як птушка з людзьмі паладзіць.*
*І сонцам абмыецца просінь.*
*І вечныя будуць на свеце*
*Дзеці і гнёзды,*
*Гнёзды і дзеці.*

**Іван РУБІН**

## Чые гэта назвы?

❶ Бацян, боцян, бусел, бусень, буська, бухал, буцэл, буцян, гайстр, лелека, лэляк, лялька, ляляк.

❷ Буслаўка, буслоўка, буслянка, бусняўка.

❸ Буслікі, буськовы гуркі.

***(Падказкі: 1 — назвы-найменні самой птушкі; 2 — назвы гнязда; 3 — назвы раслін.)***

## Народныя назіранні-прыказкі

- Бусел на балоце — касец на рабоце.
- На Дабравешчанне бусел яйка знясе.
- На Аўдокі возьмецца бусел у бокі.
- Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей.
- Дзе бусел вядзецца — там шчаслівае месца.

## Народныя прыкметы

Калі бусел туліцца да чалавечага жытла — будзе яшчэ холад.

Бусел кружыцца — чакай добрага надвор'я.

## Загадка

*Праз горы, даліны,*
*Праз тысячы сёл*
*З далёкай краіны*
*Вярнуўся пасол.*
*Спаважны, чыноўны,*
*Ён стаў на страсе,*
*У ботах чырвоных,*
*Каб бачылі ўсе.*

**Ніл ГІЛЕВІЧ**

## Красавіцкі слоўнік

| | |
|---|---|
| падбел | мать-и-мачеха |
| пралеска | пролеска, перелеска |
| курасляп | ветреница |
| дзьмухавец | одуванчик |
| гусіная цыбуля | гусиный лук |
| каташок, коцік | сережка |
| пупышка | почка |
| бярозавік | березовый сок |


**Матэрыял падрыхтавала**
**Разалія ТУФКРЭО**
**Малюнкі Алега ПАПОВА**


## Зайкава бяда

*Зайца ўбачыла сарока*
*І застракатала:*
*— Пераапранайся, белы,*
*Глянь, вясна настала!*
*Разгубіўся заяц бедны,*
*Бегае па лесе,*
*Бо забыў, дзе ўвосень*
*Шэры*
*Кажушок павесіў.*

**Вольга САВАСЦЮК**



# Займальны матэрыял



**У СВЕЦЕ БЕЛАРУСКІХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ**

Фразеалагізмы – гэта ўстойлівыя спалучэнні слоў, якія ўжываюцца як гатовыя моўныя адзінкі з цэласным значэннем. Яны ўпрыгожваюць мову, робяць яе больш выразнай, вобразнай. Большасць беларускіх фразеалагізмаў мае ацэначнае значэнне. Напрыклад, **дубовая галава –** неразумны, някемлівы чалавек; **з мухамі ў носе –** капрызны, узбаламучаны; **гнуць спіну –** вельмі многа і цяжка працаваць; **бібікі біць –** гультаяваць.

У беларускай мове сустракаюцца фразеалагізмы рознага паходжання: спрадвечна беларускія і запазычаныя. Адны фразеалагізмы сустракаюцца ў рускай і беларускай мовах, а іншыя ўласцівыя толькі беларускай мове. Напрыклад, **прыкусіць язык – прикусить язык, кроў з малаком – кровь с молоком, пад гарачую руку – под горячую руку.** Але: **свет адчыніўся – свободно вздохнул, душою загавець – отдать богу душу** і г.д. Пераклад фразеалагізмаў уяўляе пэўную складанасць. Многія з іх нельга перакладаць метадам калькавання, а неабходна адшукаць у беларускай мове выраз адпаведнай семантыкі: **до свадьбы заживёт – пакуль жаніцца – загаіцца, два сапога пара – абое рабое.**

1. Не святыя гаршкі лепяць.
2. Скруціць сабе галаву.
3. Згубіць з вачэй.
4. З выпадку.
5. Бог бацька.
6. Гады ў рады.
7. Душою загавець.
8. Як мае быць.
9. Свет адкрыўся.
10. Абое рабое.
11. Асёл маляваны (варона загуменная).
12. Блізка што.
13. Вярзці грушу на вярбе.
14. Хоць гаць гаці.
15. Як пугаю па вадзе.
16. За дзедам шведам.
17. Даць пытлю.
18. Следам за дзедам.
19. Даць рады.
20. Падпілаваць рогі.
21. Хоць вока выкалі.
22. Без году тыдзень.
23 Гаціць як у прорву.
24. У свіныя галасы.
25. Душа ў душу.
26. Ні кала ні двара.
27. Падліваць масла ў агонь.
28. Брацца ў сілу.
29. Абламаць зубы.
30. Бібікі біць.

# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**

### Беларускія скарбы

**21 красавіка** ў беларускамоўны чацвер для вучняў **5 «А» класа** была праведзена гульня **«Беларускія скарбы».** Вучні прадэманстравалі добрыя веды па этнаграфіі, мове, фальклоры і культуры Беларусі. Гэта было напружанае інтэлектуальнае спаборніцтва, і пераможцаў вызначылі толькі ў апошнім конкурсе.

Праведзенае мерапрыемства паказала, што многім з нас не хапае ў жыцці цёплых беларускіх слоў, вершаў, песень. Кожная мова, у тым ліку і наша беларуская, – гэта духоўная спадчына ўсяго чалавецтва.

**Пышнюк А.А., настаўнік беларускай мовы і літаратуры**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**

### “Браты нашы меншыя”

**28 красавіка** ў рамках беларускамоўнага чацвярга **для вучняў 6-ых класаў** прайшло мерапрыемства **“Браты нашы меншыя”.** Мерапрыемства праходзіла ў форме конкурса чытачоў: вучні з захапленнем расказвалі пра сваіх хатніх гадаванцаў, дэманструючы малюнкі і фотаздымкі сваіх лепшых сяброў. Гісторыі кожнага вучня былі ўнікальнымі і непаўторнымі, але ўсіх іх аб’ядноўвала цытата ўсім вядомага А. дэ Сэнт-Экзюперы, што “мы ў адказе за тых, каго прыручылі”. Такія мерапрыемствы выхоўваюць любоў і пашану да ўсяго жывога, падводзяць вучняў да думкі, што кожная жывая істота мае права на жыццё.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Гарэева В.М.**



# Юбілейныя даты

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**




**Алесь (Аляксандр Аляксандравіч) Жук (1947, Слуцкі раён) — беларускі пісьменнік, перакладчык. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978), Літаратурнай прэміі імя І.Мележа (1982), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1992).**

Нарадзіўся 1 красавіка 1947 г. у вёсцы Клешаў Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачага. У 1970 г. скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1972-1974 гг. служыў у Савецкай Арміі камандзірам мотастралковага ўзвода. У 1974-1977 гг. працаваў рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1977-1979 гг. – намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». У 1979-1980 гг. – інструктар пры ЦК КПБ, у 1980-1986 гг. – галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у 1986-1989 гг. – сакратар праўлення СП БССР, з 1989 г. – намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Сябра СП СССР з 1973 г. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Першыя апавяданні апублікаваў у рэспубліканскім друку ў 1965 г. Выдаў кнігі прозы «Асеннія халады» (1972), «Паляванне на старых азёрах» (1975), «Зоркі над палігонам» (1977), «Не забывай мяне» (1978), «Па саннай дарозе» (1979), «Паўстанак вяртання» (1981), «Паляванне на Апошняга Жураўля» (1982), «Чорны павой» (1986), «Праклятая любоў» (1990), «На дазорнай сцяжыне» (1990). Аўтар п'есы «Апошні журавель» (з А. Дударавым, пастаўлена ў 1986), сцэнарыя тэлефільма «Паляванне на Апошняга Жураўля» (зняты ў 1986). Па матывах аповесці «Зоркі над палігонам» зняты фільм «Палігон» (1983).

Пераклаў на беларускую мову кнігі Г. Траяпольскага «Белы Бім Чорнае вуха» (1975), зборнік апавяданняў Ю. Казакова «Арктур – гончы сабака» (1976), аповесці М.Кацюбінскага «Fata morgana» і «Дарагою цаною» (1980), У.Багамолава «Зося» (1981), раманы Н.Сафарава «Дні праклёну і дні надзеі» (1982), Т. Джумагельдыева «Прапашчы чалавек» (1984), аповесці Ю. Трыфанава «Папярэднія вынікі» (1986), М. Булгакава «Сабачае сэрца» (1989), асобныя творы іншых пісьменнікаў.

Алесь Жук адзін з самых цікавых сучасных беларускіх празаікаў, творы якога вызначаюцца тэматычнай разнастайнасцю, грунтуюцца на філасофскай і эстэтычнай аснове і з'яўляюцца роздумамі над жыццём, пісьменніка цікавіць прырода чалавечага шчасця, жыццёвыя праблемы і іх пераадоленне, асэнсаванне чалавекам самога сябе, адносіны да працы, да прыроды.

# Юбілейныя даты






**Алена Масла нарадзілася 14 красавіка 1967 года ў вёсцы Мілашова Мёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў-філолагаў.** Скончыла Мілашоўскую васьмігодку, пасля вучылася ў Мёрскай СШ №2. З 1984 па 1989 гг. – студэнтка БДУ факультэта журналістыкі. Працавала фотакарэспандэнтам у газеце "Піянер Беларусі" ("Раніца"), рэдактарам краязнаўчага аддзела ў газеце "Туризм и отдых", рэдактарам аддзела часопіса "Качели", галоўным рэдактарам газеты "Переходный возраст". З 2006 года – загадчык рэдакцыі дзіцячай літаратуры выдавецтва "Мастацкая літаратура". Піша казкі. Друкавалася ў часопісе "Маладосць", "Дзеяслоў", "Вясёлка", газеце "Літаратура і мастацтва" і інш. Аўтар кніг "Рождество у крёстной" (2005), "Таямніца закінутай хаты" (2005), "Вандроўка з божымі кароўкамі" (2007), шэрагу публікацый у перыёдыцы на тэму развіцця беларускай дзіцячай літаратуры. Паводле рэйтынгу газеты "Наша ніва" кнігі "Таямніца закінутай хаты" (2005 год) і "Вандроўка з божымі кароўкамі" (2007 год) адзначаны сярод лепшых кніг года. У 2007 годзе адзначана Пасведчаннем чытацкіх сімпатый па выніках конкурсу водгукаў "Лепшая беларуская кніга" (Беларуская бібліятэчная асацыяцыя). Маці дарослых дзяцей. Жонка найлепшага ў свеце мужа. Жыццё ўспрымае як суцэльную казку: з рознымі прыгодамі і здарэннямі, але абавязковай перамогай Дабра.

# Літаратурная старонка

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**

## Я сябе адчуваю скарбонкаю

**Я сябе адчуваю скарбонкаю.**
**Пацяшайцеся, хто ахвоч,**
**Я не грошы збіраю, а звонкія**
**Галасы салаўёў усю ноч…**

**Мудрасць кніг і радасць людскую,**
**Гнеў і гора – усё лічу.**
**Я збіраю, пішу, святкую,**
**Сто разоў у бездань лячу…**

**Я на ідалаў не малюся**
**І з няпраўдаю не міруся,**
**Дык, удача, хоць раз мне падзьмі!**
**Зноў збіраю і зноў дзялюся**
**Сваім скарбам малым з людзьмі.**

**Пімен Панчанка**



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**красавік 2022**




БУДЗЬМА БЕЛАРУСАМІ!
НЕ МАЎЧЫ ПА-БЕЛАРУСКУ



**Рэдкалегія:**

**Аліева Анастасія (9в),**
**Кузьміна Кацярына (9в),**
**Прасаловіч Юлія (9в),**
**Сарокіна Вікторыя (9в),**
**Федарэнка Вікторыя (9в).**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**